

Падчас сустрэчы міністра культуры Анатолія Маркевіча з беларусамі замежжа

# Наталіцца роднай культурай

**Творчая стажыроўка кіраўнікоў калектываў мастацкай творчасці і грамадскіх аб'яднанняў беларусаў замежжа завяршаецца сёння ў Мінску. Цягам тыдня ўдзельнікі знаёміліся са спадчынай і сучасным жыццём рэспублікі, каб пазней папулярызаваць гістарычную радзіму ў краінах пражывання.**

Геаграфія стажыровак, якія ладзіць Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур, штогод пашыраецца. Сёлета да нас завіталі 39 чалавек з Італіі, Казахстана, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Расіі, ЗША. Гэта людзі, якія ўдалечыні ад Бацькаўшчыны зберагаюць памяць пра свой радавод, захоўваюць і развіваюць традыцыі нашага народа.

Да прыкладу, ураджэнка Жлобіна **Ніна Пээрна** сорак гадоў таму пераехала на радзіму мужа, у Эстонію, аднак дагэтуль шчыруе на глебе беларускай культуры і нават далучае да яе замежнікаў. Прафесійны педагог вядзе заняткі па роднай мове, гісторыі і культуры ў нядзельнай школе "Буслікі", куды з радасцю прыходзяць не толькі дзеці з беларускімі каранямі, але і маленькія прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей. Таксама з гонарам Ніна Аляксееўна расказвае пра свой ансамбль "Дзяўчаты". Гэта сапраўдны эксклюзіў: па-беларуску спявае гурт, які цалкам складаецца з эстонскіх выканаўцаў. Традыцыйна яны ўдзельнічаюць ва ўсіх імпрэзах дыяспары, далучацца і да Дня беларускай культуры ў снежні. У яго рамках запланавана выстава дзіцячых малюнкаў па творчасці Максіма Танка. Дарэчы, нашых класікаў-юбіляраў у Эстоніі ўшаноўваюць штогод. Раней ладзілі акцыі ў гонар Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, Паўлюка Пранузы, Еўдакіі Лось, Пятра Глебкі. Сёлета выйшлі на міжнародны ўзровень. І ўпершыню падчас анлайн-конкурсу чытальнікаў вершы прагучаць не толькі на мове арыгіналу, але і па-эстон-

ску, па-ўкраінску, па-балгарску, па-руску.

З ахвотай прыляцела ў Мінск жыхарка ЗША **Ала Сандлер**. Прафесійная артыстка цяпер на валанцёрскіх пачатках узялася за незнаёмую справу — аднаўляе Музей славянскіх культур у Балтымары. Акрамя рамонту і рэарганізацыі ўстановы, спадарыні Сандлер хочацца папоўніць збор музея новымі экспанатамі. Таму візіт на радзіму яна выкарыстала як магчымасць набыць цікавыя артэфакты для экспазіцыі, а таксама набрацца ведаў ад беларускіх прафесіяналаў у сферы культуры.

Стажыроўка пачалася ў панядзелак з сустрэчы міністра культуры **Анатолія Маркевіча** з беларусамі замежжа ў Нацыянальнай бібліятэцы. Анатолій Мечыслававіч у сваім выступленні акцэнтаваў увагу на падтрымцы суайчыннікаў, якія пражываюць у іншых краінах.

— Палітыка нашай дзяржавы скіравана на тое, каб беларусы за мяжой маглі захаваць культуру сваёй нацыі, этнічную самабытнасць, адстойваць і прасоўваць інтарэсы гістарычнай радзімы ў краінах пражывання. Міністэрства культуры вядзе мэтанакіраваную і сістэмную працу па метадычнай і практычнай дапамозе нашым суайчыннікам за мяжой, — адзначыў міністр культуры.

Гэтыя словы пацвярджае статыстыка. За апошнія пяць гадоў беларускім творчым калектывам у розных краінах бязвыплатна перадалі больш за 700 камплектаў нацыянальных касцюмаў, 2 тысячы выданняў, 800 прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, 50 народных музычных інструментаў, дзяржаўную сімволіку.

Таксама Анатолій Маркевіч адзначыў важнасць культурнай і народнай дыпламатыі ў фарміраванні грамадскай думкі пра дзяржаву і беларусаў. Ён выказаў надзею, што ўдзельнікі стажыроўкі атрымаюць мноства яркіх уражанняў і ведаў, а пасля раскажуць пра сучаснае жыццё рэспублікі ў сваіх краінах. Акрамя таго, кіраўнік ведамства запрасіў суразмоўцаў да ўдзелу ў Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур і IV Фестывалі мастацтва беларусаў замежжа, запланаваным на наступны год.

Падчас сустрэчы Анатолій Маркевіч уручыў прадстаўнікам грамадскіх аб'яднанняў беларусаў замежжа ўзнагароды Міністэрства культуры і перадаў падарунак культурнаму цэнтру "Беларусь" Паўладарскай вобласці (Казахстан) — цымбалы.

Таксама беларусы замежжа змаглі задаць пытанні кіраўніку ведамства, падзяліцца дасягненнямі і расказаць пра набалелае. Многія выступоўцы выказвалі падзяку ў адрас Міністэрства культуры і Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур за метадычную і матэрыяльную дапамогу.

У той жа дзень удзельнікі стажыроўкі наведалі мемарыяльны комплекс "Трасцянец" і Храм-помнік у гонар Усіх Святых. Пазней экскурсійную праграму працягнула паездка ў замкавы комплекс "Мір" і Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік "Нясвіж". У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў адбыліся заняткі па вакале і харэаграфіі. Таксама беларусы замежжа далучыліся да майстар-класаў па народным мастацтве і паўдзельнічалі ў праекце "Беларуская скарбонка гульняў".

За шматгадовую працу і вялікі асабісты ўнёсак у захаванне, развіццё і папулярызацыю беларускай культуры ў краінах пражывання нагрудным знакам Міністэрства культуры "За ўклад у развіццё культуры Беларусі" ўзнагароджаны старшыня Алушцінскай беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Сябрына" **Віталь Бартохаў**, старшыня праўлення Беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Нёман" гарадской акругі Тальяці **Любоў Дзёміна** і старшыня культурнай асацыяцыі Bellarus у Неапалі (Італія) **Таццяна Пумпулева**. За шматгадовую плённую дзейнасць па захаванні і папулярызацыі беларускай нацыянальнай культуры Ганаровай граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь адзначаны старшыня рэгіянальнай грамадскай арганізацыі "Беларусы Башкартастана" **Раіса Зюзько**, старшыня таварыства беларускай культуры "Спадчына" ў Друскінінкаі (Літва) **Валянціна Іваноўская** і старшыня праўлення Беларускага цэнтра вучобы і развіцця EVA-Studiorum у Таліне (Эстонія) **Ніна Пээрна**.


На занятках па харэаграфіі ва Універсітэце культуры і мастацтваў